# Быць можа, й ад мёду горкі асадак застаецца

Які горкі асадак апаў на дно бурлівых пачуцьцяў. Адкуль ён узяўся? Хто заслаў гэтыя сьветлыя іскры туманамі вячэрняга змроку? Што бурыць буру жаданьняў нястрымных? Адкуль вытыркі новыя вежы — званіцы імкненьняў маіх? Ахапіць шырокія–вольныя прасторы. Абняць–бы сінь сьветазарную. Цалаваць–бы сонца, упіваючыся яго хмелем праменным. А тут не. Штосьці грудзі сьціскае. Штосьці крышыць жаданьні адно за адным.

Чаго сэрца на часткі так крышыцца? Чаго болем грудзі кроюцца? Ахапіла мяне туга чорная. Спаланіла мяне ночка цёмная. Спавілі мяне туманы сівыя. Выядаюць вочы мне росы буйныя. Эх, разьняцца–б, разыйсьціся мне. Разагнацца ў вечнасьць скутую. Разарваць–бы мне куткі змрочныя. Разарваць–бы мне шаты жалезныя. Расчыніць дзьверы радасьці нясупынныя. Напаіць ёю ўсіх, хто асмаг гарачынёю жыцьця горкага. Распусьціць крыніцы рэчкай буйнаю. Заснаваць кросны шчасьця невычэрпнага.

Гэй, разыдзіся, дай ісьці й ісьці... Ня пытай, куды. Ісьці, толькі ісьці... Волата нішто й ніхто ня можа супыніць. Яны ніжуць усё. Для іх няма дна. Глыбей і глыбей яны ніжуць і ніжуць... Што тут?! Тут агоркла. Тут абрыдзена–дадзена. Гэты шум адзіноцтвам выціскае з мястовай каляіны, прыкоўвае дзе да слупа — і стой. Ай, не, не хачу стаяць. Палячу, палячу. Буду вечна ляцець, каб усё новыя й новыя далі аглядаць, каб усё новым і новым зернем палеткі сеяць і ва ўсходах іх упівацца шчасьцем–радасьцю. Ты жывеш — ты відзен.

Думкі, думкі, не валтузьцеся. Пойдзем з вамі ў падарож вялікую...

Годзі й вам, пачуцьці, хвостаць болем грудзі надарваныя.

Ай, баліць. А раскінуць куды? Дзе рассыпаць іх мне? Дзе згубіць згубу чорную? Адстаньце–ж, звадлівыя!

*[1924]*